www.etnolog.org.ua

16. Українські прислів'я та приказки / Упоряд. С.Мишанича та М.Пазяка; Передм. М.Пазяка. – К.: Дніпро, 1983. – С. 137.
17. Українські приказки, прислів'я і таке інше: Зб. О.В. Марковича і других / Спорудив М..Номис. – СПб., 1864. – С. 283. – № 850.
18. Там само. – С. 93. – № 4769.
19. Прислів'я та приказки: Взаємини між людьми / Упоряд. М.М.Пазяк. – К.: Наук. думка, 1991. – С. 187.
20. Плохинский М. Цыгане Старой Малороссии. – М., 1889. – С. 111.
21. Українські прислів'я та приказки / Упоряд. С.Мишанича та М.Пазяка; Передм. М.Пазяка. – К.: Дніпро, 1983. – С. 44.
22. Українські приказки, прислів'я і таке інше: Зб. О.В.Марковича і других / Спорудив М.Номис. – СПб., 1864. – С. 98. – № 5055.
23. Плохінський М., Вказ. Праця. – С. 112.
24. Українські приказки, прислів'я і таке інше: Зб. О.В.Марковича і других / Спорудив М. Номис. – СПб., 1864. – С. 240.
25. Нова збірка народних малоруських приказок, прислів'їв, промовок, загадок й замовлянь / Впоряд. М.Комаров. – Одеса, 1890. – С. 99.
26. Галицько-волинські народні приповідки / Зібрав, упорядкував і пояснив д-р. Іван Франко. // Етнографічний збірник. – Львів, 1901. – Т. 10. – С. 220 (прислів'я побудоване на народному анекдоті про цигана, якого вели вішати).
27. Українські приказки, прислів'я і таке інше: Зб. О.В. Марковича і других / Спорудив М. Номис. – СПб., 1864. – С. 285.
28. Там само. – С. 221. – № 11311.
29. Там само. – С. 17. – № 780.
30. Агеева Р.А. Страны и народы: прошлое названий. – М., 1990. – С. 206.
31. Драгоманов М. Малорусские народные предания. – К., 1876, – С. 125-128, 160-162, 190-194.
32. В-в А. Из народной характеристики цыган // Киевская Старина. – К., 1886, январь. – С. 198-200.
33. Томка М. Цыгане-ремесленники в Европе // Курьер ЮНЕСКО. – 1984, ноябрь. – С. 16.
34. Українські прислів'я та приказки. / Упоряд. С. Мишанича та М. Пазяка; М. Пазяка. – К.: Дніпро, 1983. – С. 347.
35. Нова збірка малоруських приказок, прислів'їв, промовок, загадок й замовлянь / Впоряд. М. Комаров. – Одеса, 1890. – С. 99.
36. Українські прислів'я та приказки / Упоряд. С. Мишанича та М. Пазяка; Передм. М. Пазяка. – К.: Дніпро, 1983. – С. 89, 90.
37. Маркевич М.А. Обычаи, поверья, кухня, напитки малороссиян. – К., 1860. – С. 52-53; Галаган П. Цыгане в вертепной драме // Киевская Старина. – 1882, октябрь. – С. 18-28.
38. Чубинский П. Труды этнографо-статистической экспедиции в Западно-Русский край. – СПб., – Т. V. – С. 418.
39. Сумцов Н.Ф. Культурные переживания // Киевская Старина. – 1889, декабрь. – С. 582-583.
40. Байбурин А.К. Вказ. Праця. – С. 36.
41. Шевченко А. Етнічний стереотип // Мала енциклопедія етнодержавознавства. – К., 1996. – С. 55.
42. Шкляр Л.Є. Проблеми етнічності на сучасному етапі розвитку націй // Етнос і соціум. – К.: Наук. думка. – 1993. – С. 65. – 170 с.

ІМФЕ

Т. Кабржыцкая
*(Мінск)*

# ПРЫСУТНАСЦЬ УКРАІНСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ СУЧАСНАГА МІНСКА

Прысутнасць украінскай культуры ў духоўным жыцці сучаснага Мінска (а тым самым у вялікай ступені і ўсёй Беларусі) абумоўліваецца некалькімі фактарамі як станоўчага, так і адмоўнага характару. Станоўчае: у выніку атрымання Беларуссю дзяржаўнай самастойнасці (пасля распаду СССР) і дэмакратызацыі грамадскіх узаемаадносін стала магчымым прапагандаваць украінскую культуру з дапамогай УГКА – украінскіх грамадска-культурных арганізацый ("Січ", "Заповіт", "Ватра" і інш.) і ўкраінскага пасольства ў Рэспубліцы Беларусь (УП), якое ўпершыню з'явілася ў Мінску за ўвесь перыяд існавання Беларускай рэспублікі. Адмоўнае: парушыліся ранейшыя адладжаныя культурныя кантакты паміж дзвюма дзяржавамі, рэзка зменшыліся літаратурныя ўзаемасувязі. Маладыя дзяржавы, занятыя сваімі ўнутранымі праблемамі, не маюць магчымасці

www.etnolog.org.ua

актыўна прапагандаваць нацыянальныя культуры нават у краінах-суседках. Усё гэта абумоўлівае асаблівую адказнасць мясцовай інтэлігенцыі за стан прапаганды ў Мінску культуры суседняга братняга народа.

Апрача УГКА і УП, у сённяшнім Мінску прысутнасць украінскай культуры прадвызначаюць у значнай ступені Таварыства культурных сувязей з замежнымі краінамі (ТКС), Беларуская асацыяцыя ўкраіністаў (БАУ), украінскае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (УА БДУ). Па сутнасці, узнікненне гэтага аддзялення якраз і ініцыіравала БАУ. Прычым, усе названыя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі працуюць у цесным кантакце, пры ўзаемападтрымцы. Тым больш, што адны і тыя ж асобы нярэдка праяўляюць свае здольнасці адначасова ў розных установах і арганізацыях.

БАУ, УГКА і ТКС у цесным кантакце адзначаюць, па сутнасці, усе больш-менш значныя юбілеі ўкраінскіх дзеячаў культуры: Тараса Шаўчэнкі, Івана Франка, Лесі Украінкі, Максіма Рыльскага, Паўла Тычыны, Уладзіміра Сасюры… Да гэтых арганізацый нярэдка далучаецца і Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП). Вечарыны ладзяцца звычайна ці ў Доме дружбы, ці ў Доме літаратара, ці на філфаку БДУ (а часам ва ўсіх установах). БАУ пры гэтым забяспечвае навуковы ўзровень імпрэзаў, УГКТ і:– мастацкі (канцэрт), ТКС – арганізацыйны. Так, напрыклад, 185-я гадавіна з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі была адзначана навуковай канферэнцыяй у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, вечарынамі ў Доме дружбы і на філфаку БДУ. Сябры БАУ прачыталі на канферэнцыі наступныя даклады: прафесар А.Мальдзіс – “Сыны зямлі Беларусі – сябры Кабзара”, прафесар В.Рагойша – “Заповіт” Шаўчэнкі ў беларускіх перакладах”, дацэнт Т.Кабржыцкая – “Роля Т.Шаўчэнкі ў працэсе беларускага нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст.”, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я.Купалы Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі Л.Гаранін – “Нацыянальная ідэя ў творчасці Т.Шаўчэнкі”, выкладчык БДУ, кандыдат філалагічных навук У.Рагойша – “Шаўчэнкаўская тэма ў творчасці Алеся Гаруна”, аспірант БДУ П.Рагойша – “Т.Шаўчэнка і польская літаратура” і інш. Са словам пра Кабзара на вечарынах выступілі і іншыя сябры БАУ (С.Законнікаў, В.Жуковіч, А.Супрун і інш.). “Ватра” і “Січ” сваімі харавымі і сольнымі выкананнямі ўкраінскіх песень, у тым ліку на словы Шаўчэнкі, стварылі на вечарынах святочную атмасферу. Усюды перапоўненыя залы з хваляваннем успрымалі і словы прамоўцаў, і мелодыі песень.

Дзякуючы захадам БАУ, украінская тэматыка прысутнічае літаральна на ўсіх рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, што ладзяцца ў Мінску і рэспубліцы. Некалькі прыкладаў. Украіназнаўчыя даклады гучалі на міжнароднай канферэнцыі “Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай” (БДУ, 1997; “Мікола Хвылявы ў кантэксце беларускай літаратуры” – Т.Кабржыцкая, “Лясная песня” Лесі Украінкі і “Сон на кургане” Янкі Купалы: тыпалогія канфлікту” – П.Навойчык, “Рускамоўная Стэфанкіяна і некаторыя актуальныя пытанні сучаснай перакладазнаўчай навукі” – М.Шчарбак і інш.), на Купалаўскіх чытаннях “Янка Купала – публіцыст” (Мінск, 1998; “Янка Купала-публіцыст і Украіна” – Т.Кабржыцкая), на міжнарожных Ракаўскіх чытаннях (в.Ракаў Мінскай вобласці, 1998; “Мар’ян Здзяхоўскі і Украіна” – Т.Кабржыцкая) і г.д. Сябрам БАУ належыць абсалютная большасць публікацый у беларускім друку па праблемах украінскай літаратуры, украінска-беларускіх культурных узаемасувязяў.

УА БДУ узнікла ў 1995 годзе найперш дзякуючы намаганням некаторых сяброў БАУ, а таксама актыўнай падтрымцы УП і тагачаснага паўнамоцнага пасла Украіны ў Рэспубліцы Беларусь У.Жалібы. Дзесяць студэнтаў-украіністаў гэтага аддзялення не толькі старанна вывучаюць украінскую мову, літаратуру, культуру, але і актыўна ўдзельнічаюць у навуковым і грамадскім жыцці універсітэта і горада. Яны дапамагаюць УГКА у прапагандзе ўкраінскай культуры. У сваю чаргу, УГКА дапамагаюць УА БДУ у камплектацыі неабходнага біблі-ятэчнага фонду як на філфаку БДУ, так і на базе адной з мінскіх гарадскіх бібліятэк, дзе створаны спецыяльны фонд украінскай літаратуры. На філфаку БДУ частыя госці – сябры “Ватры”, “Січі”, “Заповіту” (асабліва – у час правядзення традыцыйных украінскіх калядак), супрацоўнікі УП, украінскія пісьменнікі, якія прыязджаюць з нейкай нагоды ў Мінск. Так, у розны час са студэнтамі-ўкраіністамі сустракаліся Ліна Кастэнка, Аксана Забужка, Максім Стрыха, Уладзімір Цыбулька...

Формы прысутнасці ўкраінскай культуры ў духоўным жыцці сучаснага сталічнага Мінска, несумненна, будуць пашырацца і ўдасканальвацца – па меры ўмацавання дзяржаўнасці Беларусі і Украіны, развіцця паміж імі добрасуседскіх міждзяржаўных узаемаадносін.